**Метадычныя рэкамендацыі для вывучэння курса “Гісторыя музейнай справы”**

Курс «Гісторыя музейнай справы» прызначаны для засваення студэнтамі першай ступені вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца на 2 курсе па спецыяльнасці 1-23 01 12-01 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) гістарычнага факультэта БДУ.

Мэта дадзенага курса – даць будучым спецыялістам музейнай сферы неабходны запас музеялагічных ведаў, а таксама на прыкладзе зараджэння, станаўлення і дзейнасці вядучых айчынных і замежных музейных устаноў сфармаваць падмурак прафесійных ведаў.

Галоўнымі задачамі выкладання дысцыпліны з’яўляюцца:

- фарміраванне асобы студэнта як грамадзяніна, культурнага, талерантнага, з глыбокім разуменнем сутнасці музейных працэсаў;

- фарміраванне здольнасці крэатыўнага і крытычнага мыслення ў сацыяльна-творчай і прафесійнай дзейнасці, станаўленне сучаснага стылю навукова-практычнага мыслення;

- фарміраванне падмурку музеялагічных ведаў на аснове вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай гісторыка-філасоўскай думкі;

Структураванне зместу вучэбнай дысцыпліны ажыццяўляецца праз вылучэнне ў ёй буйных структурных адзінак – модуляў (раздзелаў). На кожны навучальны модуль ў адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі вызначаецца ўсталяваная колькасць лекцыйных і семінарскіх (практычных) заняткаў.

Важнае месца для авалодання дысцыплінай адводзіцца самастойнай працы студэнтаў. Кіруемая самастойная праца студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных работ, падрыхтоўку рэфератаў, азнаямленне з навуковай, навукова-папулярнай, навучальнай, хрэстаматыйнай літаратурай, напісанне аглядаў, складанне сінхранічных табліц і інш.

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта робіцца з дапамогай правядзення па дысцыпліне экзамена. Ацэнка прамежкавых вучэбных дасягненняў студэнтаў выконваецца паэтапна па канкрэтных модулях навучальнай дысцыпліны ў адпаведнасці з усталяванай на гістарычным факультэце БДУ шкалой ацэнак. Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Выяўленне вучэбных дасягненняў студэнтаў пры выніковым ацэньванні праводзіцца шляхам правядзення вуснага апытання і прэзентацыі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЛЯ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

| Нумар раздзела, | | Колькасць аўдыторных гадзін | Кірауемая самастойна | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|

| | Назва раздзела, тэмы, занятка | Лекцыі | (семінарскія) Заняткі | лабараторныя заняткі | я праца студэнта | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 9 |
| 1.1 | **Асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя паняцці, крыніцазнаўства і гістарыяграфія гісторыі музейнай справы і аховы помнікаў.** | 6 | 2 | -- | - | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 2. | **Перыяд дамузейнага збіральніцтва.** | 4 | 2 | – | – | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 3. | **Узнікненне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Адраджэння.** | 4 | 2 | – | – | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 4. | **Фармаванне як сацыяльнага інстытута ў эпоху Асветы.** | 6 | 4 | – | – | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.5 | **Пераўтварэнне музеяў у публічныя ўстановы у першай палове XIX ст.** | 6 | 4 | – | 2 | Экспрэс-апытанне |
| 1. 6. | **Пашырэнне музейнай сеткі і спецыялізацыя музеяў у другой палове XIX - пачатку XX стст.** | 6 | 6 | – | 2 | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1.7. | **Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы паміж двума сусветнымі войнамі.** | 10 | 6 | – | 2 | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| 1. 8. | **Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў другой палове XX в.** | 10 | 6 | – | 2 | Індывідуальныя кансультацыі, вуснае апытанне, дыскусія |
| **Разам:** | | **52** | **32** | | **8** | |